ватизации, и для дальнейшего его завершения необходимы соответствующая государственная политика и формирование механизмов её действия.

## АНАЛІЗ УМОЎ І ФАКТАРАЎ РАЗВІЦЦЯ ЭКАНАМІЧНАГА АСПЕКТА ІНТЭГРАЦЫІ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І РАСІЯЙ

Громак У.А.
Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт

Эканоміка Беларусі і эканоміка Расіі звязаны цеснымі варункамі, і, як след, крызіс жніўня 1998г. у расійскай эканоміцы не мог не закрануць гаспадарку Беларусі. Павялічылася вартасць паступаючых з Расіі паліўна-энэргетычных рэсурсаў, сыравіны і матэрыялаў, скараціліся закупкі беларускіх машын і абсталявання расійскімі спажыўцамі з-за недахопу ў іх сродкаў.

Але Расійская Федэрацыя – асноўны эканамічны і гандлёвы партнёр Рэспублікі Беларусь. На яе долю ў 1999г. прыходзілася 55,6% агульнага аб'ёму знешняга гандлю Беларусі.

Рэспубліка Беларусь таксама з'яўляецца адным з асноўных гандлёвых партнёраў Расійскай Федэрацыі, займаючы чацвертае месца ў знешнегандлёвым абароце пасля Германії, Украіны і ЗША. На гандаль з Беларуссю ў 1999г. прыходзілася 6,1% расійскага экспарту.

У 2001г. назіраецца павелічэнне тавараабароту Беларусі з Расіяй на 31,3% у параўнанні з 1999г., які складае 9190,4 млн дал., у тым ліку экспарт складае 3941,0 млн дал., павялічыўшыся ў параўнанні з 1999г. на 21,9%, а імпарт – 5249,4 млн дал., які павялічыўся на 39,6%. Сальда знешняга гандлю адмоўнае і складае 1308,4 млн дал.

Аналізуючы таварную структуру экспарту і імпарту паміж Беларуссю і Расіяй можна зазначыць, што яна істотна не мяняецца на працягу доўгага прамежку часу. Беларусь экспартуе ў асноўным машыны, абсталяванне, механічныя прылады, транспартныя сродкі, імпартуе – паліва мінеральнае, чорныя металы і прадукцыю хімічнай прамысловасці.

Галоўнай мэтай эканамічнай інтэграцыі Беларусі і Расіі з'яўляецца рэалізацыя агульных для абедзвюх дзяржаў стратэгічных і цякучых цікавасцяў у вырашэнні праблемы павышэння ўзроўня жыцця народу на аснове эфектыўнага выкарыстання пераваг міжнароднага падзелу працы, спецыялізацыі і кааперацыі вытворчасці, стварэння спрыяльных умоваў для аднаўлення эканамічнага росту. Дасягненне гэтай мэты прадугледжвае правядзенне ўзгодненай палітыкі ў галіне структурнай перабудовы эканамікі, гарманізацыю і адзіную накіраванасць эканамічнах рэформаў, здзяйсненне адзінай палітыкі ў галіне дзяржаўнага рэгулявання сацыяльна-эканамічных працэсаў, знешнеэканамічнай дзейнасці, а таксама ўзгодненай сацыяльнай палітыкі. Аднак рэалізацыя і гэтага Пагаднення адбываецца з вялікімі цяжкасцямі. Пагадненні не заўсёды выконваюцца. Вельмі шмат пытанняў знаходзіцца ў стадыі разгляду, хаця шматлікія з іх відавочны для Саюзнай дзяржавы. На практыцы да сёняшняга часу не забяспечаны роўныя ўмовы суб'ектам гаспадарання.

1. Расійска-беларуская эканамічная інтэграцыя пакуль развіваецца не столькі ў адпаведнасці з гаспадарча-рацыянальнымі разлікамі, колькі з'яўляецца наступствамі ініцыятыў кіраўніцтва Расіі і Беларусі, улічваючы перш за ўсё геапалітычную і ваенна-стратэгічную складаючую саюзу абедзвюх краін.

2.Паколькі Расія праводзіць курс на ліберальныя ў сваёй аснове рынкавыя рэформы, а Беларусь арыентуецца на рэфармаванне сваёй эканомікі пад жорсткім дзяржаўным кантролем, настолькі інтэграцыйныя працэсы паміж імі развіваюцца павольна, супярэчліва, а шматлікія з абвешчаных намаганняў так і застаюцца дэкларацыямі аб намерах. 90% з 1300 прававых актаў, заключаных паміж саюзнікамі, пакуль "не працуюць".

3. Пры ўсёй спецыфіцы беларускай мадэлі фармавання эканомікі яна тым не менш набліжаецца да рынкавых параметраў гаспадарання. Ва ўмовах больш шырокага развіцця рынкавых адносінаў эканамічная інтэграцыя Расіі і Беларусі стане вызначацца магчымасцямі і патрэбамі іх эканомік, пяройдзе ў плоскасць пераважна эканамічных, а не палітычных адносінаў.

Па прагнозных дадзеных у 2005г. узаемны тавараабарот узрасце да 11,1 – 14,85 млрд дал., у залежнасці ад варыянтаў развіцця эканомік краін. Сальда знешняга гандлю наблізіцца да станоўчага: па I варыянту – - 0,04 млрд дал., па II варыянту – 0,17 млрд дал.

У межах I варыянту расійскія эксперты прагназуюць у 2001 – 2005 гадах прырост узаемных паставак на ўзроўні 1,5 – 1,6 % у год, то бок экспарт Рэспублікі Беларусь у Расію складзе ў 2005 годзе – 5,25 млрд дал. (114,1% да ўзроўня 1998г.).

Прагназуецца павелічэнне экспарту ў Расію з 3,24 млрд дал. у 1999г. да 7,3 млрд дал. у 2005г. пры адкрытасці расійскага рынку, растучай канкурэнтаздольнасці расійскіх прадпрыестваў, якое патрабуе, акрамя выканання плана развіцця Расіі і плана інтэграцыйных мерапрыемстваў па павышэнню якасці беларускіх тавараў і зніжэнню выдаткаў па іх вытворчасці.

Стратэгія развіцця экспарту па гэтаму варыянту патрабуе перавыканання галінамі і канцэрнамі прадстаўленых прагнозных паказчыкаў у сярэднім на 30%.

Зыходзячы з аб'ектыўных меркаванняў інтэграцыя рухаецца наперад. Пацвердзіць гэтае можа той факт, што Беларусь здзяйсняе рэгулярны таварапамен з 79 з 89 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Самыя вялікія паказчакі з Масквой, Цюменскай вобласцю, Санкт-Пецярбугам і Маскоўскай вобласцю.

Для Беларусі эканамічны саюз з Расіяй можа стаць рэальнай дапамогай у выйсці з крызісу. І, напэўна, інтэграцыя з Расіяй, а не з краінамі Заходняй Еўропы, на сённяшні дзень і ў сённяшніх умовах з'яўляецца самай аптымальнай для Беларусі.